

Ахова птушак Бацькаўшчыны

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

BirdLife INTERNATIONAL PARTNER

www.ptushki.org

№2(41) - 2010

Фестиваль куликов собирает друзей

Уже второй год подряд АПБ и Туровский городской исполнительный комитет проводят Фестиваль куликов. Он проходит рядом с уникальным Туровским лугом – одним из наиболее важных мест для гнездования и остановки во время миграций целого ряда видов водно-болотных птиц. Именно на Туровском лугу находится крупнейшее в Беларуси стабильное поселение занесенного в Красную книгу кулика – мородунки, в честь которой в 2009 году в Турове был установлен единственный в мире памятник.



Дефиле «Кулічная мода»

В рамках фестиваля в Туровском горисполкоме прошел научно-практический семинар «Открытые пойменные луга: роль в поддержании биологического разнообразия, современные проблемы и пути решений». В ходе семинара был затронут ряд острых вопросов – развитие весенней охоты, инфраструктурного развития, деградации местообитаний водно-болотных птиц.

На Центральной площади Турова в это время развернулась развлекательно-познавательная программа. Отличительной чертой Фестиваля куликов в Турове является познавательный и обучающий аспект. В ходе фестиваля любой желающий смог принять участие в творческих мастер-классах по изготовлению птиц из глины, соломки, в технике витража, живописи по ткани.

Затем на площади Турова прошла концертная программа с участием лауреатов детских творческих конкурсов, посвященных птицам Туровского луга, фольклорных коллективов Туровщины и известных детских музыкальных коллективов «Вянок» и «Рарох». В рамках фестиваля прошел единственный в Беларуси конкурс-дефиле «Кулічная мода», на котором были представлены коллекции, созданные юными дизайнерами Туровского региона и модельерами Центра молодежной моды БГУ.

Также администрации Турова были переданы и установлены специальные знаки, свидетельствующие о том, что Туровский луг имеет статус Территории, важной для птиц международного значения.

Лида Пшеницина, один из организаторов фестиваля
Фото О. Лукшиц



Мастер-классы по изготовлению птиц из соломки



В. Фенчук вручает председателю туровского горсовета И. Митюричу копию аншлага, установленного на ТВП «Туровский луг»

У Беларусі на 7 ТВП стала больш!



Налібоцкая пушча. Фота В. Лукшыц

У красавіку сем новых тэрыторый атрымалі афіцыйны статус Тэрыторыі, важнай для птушак (ТВП). Тэрыторыя, важная для птушак – гэта тэрыторыя, якая з'яўляецца жыццёва важнай для захавання папуляцыі аднаго ці некалькіх відаў птушак падчас зімоўкі альбо міграцыі. Статус ТВП атрымалі наступныя тэрыторыі: Лясная (Брэсцкі, Камянецкі раёны), Арэхаўскае (Маларыцкі раён), Дзівін-Вялікі Лес (Кобрынскі раён), Днепр (Лоеўскі, Брагінскі раёны), Волхва (Лунінецкі, Жыткавіцкі раёны), Чырвоны Бор (Расонскі раён), Налібоцкая пушча (Іўеўскі, Навагрудскі, Валожынскі, Стаўбцоўскі раёны). Цяпер у Беларусі 49 ТВП.

Даведка АПБ:

Міжнародная праграма «Тэрыторыі, важныя для птушак» (Important Bird Areas (IBA)) пачала працаваць у 80-х гадах 20 стагоддзя па ініцыятыве міжнароднай прыродаахоўнай асацыяцыі BirdLife International. Праграма накіравана на выяўленне і захаванне тэрыторый, якія маюць важнае значэнне для жыцця птушак. Зараз у ёй удзельнічаюць больш за 170 краін ва ўсім свеце, у якіх выдзелена больш за 13 тысяч ТВП, якія ўключаюць месцы гнездавання, міграцый і зімовак птушак.

Беларусь далучылася да праграмы ТВП у 1996 годзе.

«Няўжо наша смерць так патрэбна вам, людзі?»



В декабре прошлого года мы обратились к вам с просьбой сделать бумажные фигурки гусей с целью выразить свой протест против весенней охоты. В данной акции активное участие приняли школьники – члены клубов «Крылатый дозор». С вашей помощью мы собрали больше пяти тысяч оригами, за что всем выражаем огромное спасибо!

11 марта 2010 года все оригами были отправлены на имя Владимира Макея, Главы Администрации Президента Республики Беларусь. В своих кратких посланиях на крыльях птиц дети обратили внимание на проблему сохранения серых гусей и просили прекратить весеннюю охоту на водно-болотных птиц в Республике Беларусь.

Вот только несколько примеров их посланий:

«Вам это необходимо? Ответьте себе честно…»

«Твои дети не могут жить без родителей, а мои?»

«Если ты наслаждаешься жизнью, то почему я не могу?»

«Няўжо наша смерць так патрэбна вам, людзі?»

«Запретим весеннюю охоту на гусей!»

Наше обращение было рассмотрено на заседании Координационного совета по охотничьему хозяйству. Министерство лесного хозяйство проинформировало АПБ, что новой редакцией правил ведения охотничьего хозяйства и охоты будет предусмотрен ряд мер по сохранению водно-болотных птиц и, в частности, серого гуся.

Основные положения проекта:

- Минприроды по представлению ПАН Беларуси и согласованию с Минлесхозом предоставляется право устанавливать ограничения и запреты на охоту в отдельных местах, на отдельные виды, отдельными способами. Это позволит ограничить или полностью запретить в республике охоту на гусей всех видов в местах гнездования серого гуся;
- Начало летне-осенней охоты на гусей перенесено с первой субботы августа на третью субботу сентября;
- В период с 11 до 18 часов охота на гусей будет запрещена;
- Запрещается охота на гусей с подхода;
- Весенняя охота на уток будет разрешена только на селезней кряквы и только из засады.

Будет ли принят данный проект, покажет время. По мнению Координационного совета, данные меры будут намного эффективнее для охраны местной гнездящейся популяции серого гуся, чем запрет на охоту на серого гуся при разрешении повсеместной охоты на другие виды гусей. Объясняется это только тем, что при введении запрета на охоту только на серого гуся охотник, случайно добывший его, автоматически становится нарушителем Правил ведения охотничьего хозяйства и может быть привлечен к ответственности за незаконную охоту.

Напомним, что АПБ выступает за введение запрета на весеннюю охоту на водно-болотных птиц в целом.

Першая перамога

Негледзячы на тое, што беларускі Урад пакуль што не прыняў ніякага рашэння наконт забароны веснавога палявання ў нашай краіне, выйсце ўсё ж існуе. Першыя крокі ў гэтым накірунку зрабілі дырэкцыі ДПУ «Спораўскі» і «Ельня». Па іх ініцыятыве, падтрыманай раённымі выканкамамі, мясцовыя паляўнічыя калектывы прынялі рашэнні аб стварэнні «зон спакою» на тэрыторыях заказніка «Ельня» і большай часткі заказніка «Спораўскі». Веснавое паляванне на водна-балотных птушак у гэтых зонах будзе забаронена.

Шчыра віншуем нашых калег з перамогай!

Лісты са зваротам падтрымаць гэтую ініцыятыву былі напраўлены да дырэкцый іншых прыродаахоўных устаноў, у першую чаргу створаных на буйных міграцыйных шляхах.

Фотаконкурс АПБ

Штогадовы фотаконкурс АПБ «Птушка ў аб'ектыве» змяніў правілы свайго правядзення. Цяпер ён будзе праходзіць у два этапы.

Першы этап – этап адбору здымкаўфіналістаў – будзе адбывацца ў галерэі на сайце www.birdwatch.by. Для таго, каб размясціць свае здымкі ў галерэі, аўтарам неабходна зарэгістравацца на сайце. На працягу кожных двух тыдняў будуць абірацца найлепшыя 5 фотаздымкаў у двух катэгорыях: "Птушкі" і "Людзі" (маюцца на ўвазе людзі, якія назіраюць/ вывучаюць/ фатаграфуюць птушак). Удзельнічаць у галасаванні змогуць таксама толькі зарэгістраваныя карыстальнікі сайту.

На кожны двухтыднёвы конкурс адзін аўтар можа выставіць не больш за 5 сваіх здымкаў у кожнай з катэгорый. Калі здымкаў падаецца больш, трэба ў іх апісанні пазначыць, якія работы выстаўляюцца па-за конкурсам. Дата апошняга двухтыднёвага адбору здымкаўфіналістаў пакуль не прызначана.

Адабраныя пяцёркі здымкаў будуць ацэньвацца напрыканцы года. Журы назаве пераможцаў і прызёраў фотаконкурса, выбраўшы найлепшыя работы з ліку здымкаў-фіналістаў. Як і ў папярэднія гады, здымкі пераможцаў будуць надрукаваны і складуць выставу, якая будзе паказана на З'ездзе АПБ.



Фота пераможцы папярэдняга конкурсу Мікалая Верабя


Аўтараў найлепшых фотаработ чакаюць каштоўныя прызы.

Поспехаў у старым-новым фотаконкурсе!

P.S. Аўтары, якія здымаюць на стужкавы фотаапарат, таксама могуць выставіць свае работы на конкурс. Для гэтага неабходна адсканіраваць фатаграфію і загрузіць яе на сайт. Калі ў Вас узнікнуць складанасці з гэтым, калі ласка, звяртайцеся ў сакратарыят.

Палажэнне аб прэміі імя Канстанціна Тызенгаўза

Зацверджана Рашэннем Савета АПБ ад 30.10.2009



Граф Канстанцін Тызенгаўз нарадзіўся і быў пахаваны ў мястэчку Жалудок (цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобл.). Выдатны заолаг і арнітолаг, аўтар некалькіх артыкулаў і кніг пра птушак ("Асновы арніталогіі, навукі аб птушках" (1841); "Агульная арніталогія, альбо апісанне птушак усіх частак свету" (1843-1846); "Каталог птушак і млекакормячых ВКЛ і Каралеўства Польскага" (1844), у якім былі апісаны 351 від птушак і 167 відаў звяроў з тэрыторыі Беларусі, Польшчы, Літвы і Украіны; ілюстрацыйныя табліцы да "Анталогіі польскіх птушак" з тэкстам У. Тачаноўскага – выйшла ўжо па смерці Тызенгаўза (1862)). Стваральнік адной з самых вялікіх тагачасных еўрапейскіх калекцый пудзіл птушак, якую збіраў ва ўласным палацы ў мястэчку Паставы (цяпер раённы цэнтр у Віцебскай вобл.). З'яўляецца заснавальнікам беларускай арніталогіі.

1. Мэта прысуджэння прэміі – стымуляванне моладзі да вывучэння і аховы птушак на навуковай аснове.
2. Заяўкі на атрыманне прэміі разглядаюцца штогод. Калі Камітэт прэміі палічыць узровень дасланых на конкурс прац не адпаведным яе ўзроўню, у асобныя гады прэмія можа не прысуджацца.
3. Прэмію могуць атрымаць студэнты і магістранты ВНУ Беларусі ці замежжа за дасягненні ў вывучэнні і/ці ахове птушак Беларусі. Адна асоба можа быць узнагароджана прэміяй некалькі разоў.
4. Прэмія ўручаецца на чарговым З'ездзе АПБ, калі Камітэт не прыме іншае рашэнне.
5. Заяўку на атрыманне прэміі могуць падаваць студэнты і магістранты ВНУ Беларусі да 1 верасня бягучага года. Небходна, каб як мінімум на 1 мая года падачы заяўкі кандыдат меў адпаведны для гэтага статус. Заяўка падаецца на адрас АПБ у свабоднай форме, з пералікам прац кандыдата.
6. Да заяўкі павінны быць прыкладзены апублікаваныя ці прынятыя да публікацыі навуковыя працы (артыкулы, тэзісы) і/ці дыпломная (магістэрская) праца, якія сведчаць пра значныя дасягненні саіскальніка прэміі ў вывучэнні і/або ахове птушак.
7. Камітэт Прэміі выбіраецца Цэнтральным Саветам АПБ тэрмінам на 3 гады і складаецца з не менш чым 5 чалавек.
8. Прэмія прысуджаецца аднаму з кандыдатаў большасцю галасоў чальцоў Камітэту.
9. Прэмія ўяўляе сабой памятны знак з выявай Канстанціна Тызенгаўза і грашовую частку, памер якой вызначае ЦС АПБ.
10. Камітэт сам прымае распарадак сваёй працы, вылучае Старшыню, размяркоўвае абавязкі сярод сваіх чальцоў, распрацоўвае крытэрыі адбору найлепшых работ.

Навіны праектаў

Каждой птице – свое гнездо

Общеизвестно, что путем развешивания искусственных гнездовий можно привлекать не только мелких воробьиных птиц, но также представителей других отрядов.



Искусственное гнездовье для кряквы

Работа, проделанная в этом направлении АПБ при финансовой поддержке ПРООН в Беларуси, выполнялась в рамках проекта «Создание условий для устойчивого функционирования системы охраняемых водно-болотных угодий в Белорусском Полесье». Основными территориями для установки гнездовий были выбраны заказники «Средняя Припять», «Простырь», «Званец» и «Споровский».

В рамках проекта было разработано методическое руководство, которое содержит информацию о роли биотехнии в увеличении численности обычных и сохранении редких видов птиц, а также рекомендации по изготовлению и установке гнездовий для редких и водоплавающих видов птиц.

Что касается практической части работы, то в общей сложности было установлено 205 гнездовий для кряквы и 57 гнездовий для редких и охраняемых видов, из них: 30 для белой лазоревки, 4 для сизоворонки, 1 для орлана-белохвоста, 3 для большого подорлика, 6 для малого подорлика, 3 для филина, 3 для бородатой неясыти, 3 для воробьиного сыча и 4 для мохноногого сыча.

С завершением проекта биотехнические работы, проводимые АПБ, не останавливаются. Специалисты организации по-прежнему продолжают делать и вывешивать гнездовые ящики сизоворонки – редкой ракшеобразной птицы, численность которой за последние десятилетия катастрофически уменьшилась.

Сергей Зуенок, координатор проекта
Фото автора

Вясна – пара рамантаваць!

У красавіку і траўні адбыўся штогадовы рамонт плацін на балоце Ельня. Як і ў мінулыя гады, праект «Захаваем Ельню разам!» быў прафінансаваны кампаніяй ЗП «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусія», а ўдзельнікамі сталі захавальнікі ТВП «Балота Ельня».



Захавальнікі аднаўляюць плаціну

Трэба адзначыць, што надвор'е ў красавіку не спрыяла працы на балоце, але ўсе, хто меў магчымасць прыняць удзел, не сталі мяняць планы і мужна трывалі халодны вецер, дождж і высокую ваду. З трох пабудаваных у 2008 годзе плацін было адрамантавана дзве. На поўначы балота былі агледжаны і падпраўлены яшчэ пяць плацін, пабудаваных на канале, які выходзіць з азёр Курганістае і Лебядзінае.

Вельмі важна, што гэта праца была зроблена ранняй парой, што дазволіць пакінуць на балоце больш вады на лета. У працы прынялі ўдзел захавальнікі з Міёр, Шаркаўшчыны, вёсак Чапукі, Наўгароды, Германавічы, Старыя Крукі. Усе яны змаглі зрабіць свой асабісты ўнёсак у адраджэнне балота, якое ім неабыякава і адыгрывае важную ролю ў іх жыцці. Удзел захавальнікаў у рамонце плацін – канкрэтны прыклад дзейнасці, што закранае інтарэсы як прыроды, так і людзей.

Развіццё сеткі захавальнікаў ТВП «Балота Ельня» адбываецца ў рамках праекта «Стварэнне сеткі захавальнікаў вакол ключавых водна-балодных угоддзяў Беларусі» пры фінансавай падтрымцы Nordic Council of Ministers.

Вольга Лукшыц, каардынатар праекта
Фота аўтара

Птушкі – усім узростам даспадобы!

Праект з такой назвай распачаўся у снежні мінулага года. На працягу дзесяці сустрэч з бабулямі і дзядулямі мы атрымалі столькі уражанняў, што вельмі хочацца падзяліцца з усімі.



Адна з удзельніц праекта з самаробнай паштоўкай

Напрыклад, былі ў інтэрнатах жанчыны (а некаторым з іх каля 80-ці гадоў), якія чыталі вершы пра птушак яшчэ са школьнай праграмы. У адным інтэрнаце пражывае родны брат знакамітага беларускага кампазітара Уладзілен Сямёнавіч Ханок. Ён быў так уражаны нашай сустрэчай, што сказаў нам на развітанне: "Я папрашу брата напісаць гімн АПБ!"

Першыя заняткі былі прысвечаны знаёмству с зімуючымі птушкамі горада Мінска і вырабу паштовак. Якія ж цудоўныя майстры нашы бабулі і дзядулі! Вясёленькія калядныя птушачкі радасна пазіралі на нас з самаробных паштовак. А колькі радасці было, што ўсё задуманае атрымалася, ды яшчэ і птушачку новую вывучылі!

У студзені мы пачалі рабіць кармушкі. Жанчыны майстравалі мініслоўкі з пластыкавых бутэлек і нават упрыгожвалі іх; мужчыны спрытна ладзілі сур'ёзныя драўляныя "рэстарацыі", якія паслужаць не адзін год на карысць нашым меншым сябрам. Сумесная праца спадабалася ўсім – і арганізатарам, і удзельнікам, а асабліва птушкам – таму што цяпер рэшткі абедаў і сняданкаў будуць рэгулярна з'яўляцца ў птушынай сталоўцы.

Наталля Парэчына, каардынатар праекта
Фота аўтара

День Земли в заказнике «Лебяжий»

В прошлом номере мы писали о том, что заказнику «Лебяжий» исполняется 25 лет. На День Земли 22 апреля там решено было провести массовые природоохранные мероприятия. Инициаторами акции стали АПБ и Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды при поддержке Министерства юстиции, Экологической гимназии №19, детского фонда ООН (ЮНИСЕФ), иностранного предприятия «Кока-кола Бевриджиз Белоруссия», компании «Центр Интернационал».

В рамках акции на воду были спущены и заякорены на середине пруда три плота, предназначенные для временного отдыха и гнездования водно-болотных птиц. На одном из них насыпан песок, на двух других сложены старый тростник и осока.

Во второй части мероприятия все участники дружно направились собирать мусор с территории заказника. Юные экологи из Экологической гимназии №19 вместе с Министром природных ресурсов и охраны окружающей среды, специалистами АПБ, представителями коммерческих организаций очистили береговую линию, луг и участки древесных насаждений от мусора.

Несмотря на непогоду, все участники акции остались довольны своим посильным вкладом в поддержку природного комплекса. Остались довольны и птицы. Известно, что на плотах уже гнездятся озерные чайки и речные крачки.




Министр природных ресурсов и окружающей среды Цалко В. Г., директор АПБ Фенчук В.А. и заместитель генерального директора ИП «Кока-кола Бевриджиз Белоруссия» Рощупкин А.В. спускают гнездовые плотики на воду

Соловьев по весне считают

В нынешнем году акция «Соловьиные ночи» началась еще более активно по сравнению с прошлыми годами. Первые сообщения о местах пения соловьев начали поступать задолго до того, как была объявлена акция. С 15 на 16 мая о своих соловьях рассказывали жители практически со всех областей страны. В Минске были организованы соловьиные площадки, которые посетило рекордное количество человек – более 2 тысяч! Получено 217 сообщений о местах пения соловьев. Только в Минске учтено 318 мест их активного пения. Традиционно составлена соловьиная карта Минска, на которой отражены все соловьиные места.

Соловьиные ночи звучат, они нравятся людям, и участвовать в них легко и доступно для всех желающих. В нынешнем году добавились еще и соловьиные экскурсии, на которых любители природы смогли научиться определять по внешнему виду и даже голосу не только соловьев, но и другие самые обычные виды певчих птиц. Не случайно акцией заинтересовалась всемирная служба Би-би-си (BBC). Отдельная экскурсия была проведена с участием корреспондента из мировой телерадиовещательной компании. Несмотря на то, что начало июня – время, в которое соловьи поют уже меньше, наш соловей пел во всю, как будто бы знал, что его пишет корреспондент BBC. Об особенностях соловьиных песен рассказал один из лучших знатоков певчих птиц – Виталий Якович. Он же напомнил, что акция «Соловьиные ночи» уверенно и ненавязчиво становится хорошей традицией для всех любителей птиц и других неравнодушных людей.

Руслан Шайкин, специалист по экологическому образованию



Соловьиная карта Минска-2010

www.birdwatch.by

Год, каб трапіць у 30 лепшых



Год таму, 5 мая 2009 г. наш сайт стаў афіцыйна карыстацца сваёй назвай – **www.birdwatch.by.** За гэты час ён стаў месцам для самавыяўлення ўсіх, хто любіць птушак і хоча даведацца пра іх больш, а таксама расказаць пра сваё захапленне іншым.

27 мая 2009 г. мы далучыліся да сусветнай сістэмы вызначэння рэйтынгу сайта па яго наведвальнасці, якая ў той час называлася TOP 1000 Birding Websites. Пачалі мы сваё падарожжа ўверх з 960 месца і праз тры дні былі ўжо сярод лепшых 500 сайтаў.

Аднак значна лепшыя рэйтынгі чакалі да пачатку гэтага году, калі, дзякуючы здымкам свірстуна, які аказаўся горным, мы змаглі перакрочыць рубеж першай сотні самых папулярных бёдуотчарскіх вэб-старонак.

І вось узяты новыя рубяжы! Мы – сярод першых 30! Канечне, скачок у лік 30 найлепшых адбыўся амаль выключна дзякуючы кругласуткавай трансляцыі з гнязда сокала-пустальгі ў Брэсце.

Сёння мы толькі ў пачатку цікавага шляху. Наперадзе шмат працы, але не менш і задавальнення ад таго, што яна атрымліваецца. Будзьма разам – толькі так мы зможам дасягнуць большага!

Дзьмітры Вінчэўскі, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення

Глядзець за жыццём Птушкі 2010 года можна 24 гадзіны ў суткі

Дзякуючы Гродзенскаму абласному і Заходне-Палескаму рэгіянальнаму аддзяленню АПБ ў канцы сакавіка ўпершыню ў нашай краіне былі ўсталяваны 2 вэб-камеры на гнёздах сокала-пустальгі на касцёле ў Гродна і на жылым шматпавярховіку ў Брэсце. З пачаткам гнездавання самыя цікавыя моманты – адкладка яек, змена птушак падчас іх інкубацыі, прынос здабычы на гняздо, вылупленне птушанят і іх кармленне самкай –выкладваюцца ў выглядзе фотаздымкаў і відэафільмікаў на сайце АПБ **www.birdwatch.by.** З канца красавіка можна таксама падглядваць за брэсцкім гняздом у любы час сутак тут: **http://birdwatch.by/pustalga_brest.**

Штодня за нашай Птушкай года он-лайн падглядваюць ад 700 да 1200 чалавек амаль з усяго свету: Польшчы і ЗША, Украіны і Бразіліі, Вялікабрытаніі і Індыі, Чэхіі і Венесуэлы і г.д. Самыя цікавыя моманты можна каментаваць непасрэдна пад акном трансляцыі і чытаць каментары іншых карыстальнікаў.



Самка пустальгі корміць птушанят

Прыкладна да канца чэрвеня (менавіта ў гэты час хутчэй за ўсё птушаняты ўжо выляцяць з гнязда) вы можаце назіраць за сакаламі самі, паказаць трансляцыю з гнязда сваім дзеткам, вучням, гурткоўцам, сябрам. Запрашаем скарыстаць з гэтай унікальнай і цікавай магчымасці!

Праект ажыццяўляецца дзякуючы дапамозе Шведскага арніталагічнага таварыства SOF, Таварыства для дзікіх жывёл "Сокал" (Польшча), Касцёла Узвышэння Святога Крыжа (Бернардынскі) у Гродна і інтэрнэт-правайдэра "Элнэт" з Брэста. Таксама праекту дапамагаюць і забяспечваюць інфармацыйную падтрымку многія СМІ Беларусі, у тым ліку найбуйнейшы інтэрнэт-партал TUT.by.

Дзьмітры Вінчэўскі, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення

Марки с пустельгой



19 марта 2010 года Министерство связи и информатизации Республики Беларусь выпустило в обращение почтовую марку «Обыкновенная пустельга» из серии «Птица года».

Художник Александр Митянин. Тираж марки 70,0 тыс. Марка печаталась с логотипами международной ассоциации «BirdLife International» и общественной организации «Ахова птушак Бацькаўшчыны».

Итоги зимних учетов птиц: не только посчитать, но и накормить!

В нынешнем году гораздо больше, чем в предыдущие годы, стало количество участников акции «Птицы на кормушке». Участие приняли 429 человек, включая учащихся общеобразовательных школ и внешкольных учреждений. Активно присоединились к масштабной подкормке птиц и люди пенсионного возраста.

Впервые в истории АПБ зимние учеты ознаменовались потоком звонков. Многие люди с удовольствием звонили и сообщали о встреченных зимой птицах. Всего поступило более 50 звонков. С момента проведения зимних учетов птиц в Беларуси такого количества звонков еще не было. Этому способствовали периодически выходящие радиопередачи о зимних учетах птиц и правилах их подкормки. Неподдельный интерес звонивших людей к птицам и обращение именно к нам показывает, что АПБ становится еще и консультационным центром по определению различных видов птиц, особенностям подкормки, привлечения их на участки и источником другой полезной информации.

Интересным результатом стало так называемое народное просвещение. Как место для общения были организованы наблюдательные площадки. На них любители природы сообщали о том, что в их местности пропали те или иные птицы, чаще всего в центре внимания оказывались снегири. Другие же рассказывали, что эти птички держатся в районе постоянно и даже регулярно посещают их кормушки.

Необходимо отметить активность отделений и активистов АПБ. По-прежнему координатором зимних учетов и акции «Птицы на кормушке» выступало Мядельское районное отделение АПБ, а координатором учета водоплавающих птиц – Иван Багданович. Минское городское отделение АПБ успешно организовало наблюдательную площадку в столице в парке им. Горького, на которой побывало 169 любителей природы.

Руслан Шайкин, специалист по экологическому образованию

Птицы на кормушке

ВИД	
Большая синица Parus major	1747
Белая трясогуска Motacilla alba	1
Буроголовая гаичка Parus montanus	6
Вяхирь Columba palumbus	10
Галка Corvus monedula	246
Грач Corvus frugilegus	8
Длиннохвостая синица Aegithalos caudatus	4
Домовой воробей Passer domesticus	1022
Кедровка Nucifraga caryocatactes	1
Кольчатая горлица Streptopelia decaocto	3
Московка Parus ater	3
Обыкновенная зеленушка Chloris chloris	120
Обыкновенная лазоревка Parus caeruleus	74
Обыкновенная овсянка Emberiza citrinella	231
Обыкновенная пустельга Falco tinnunculus	1
Обыкновенный дубонос C. coccothraustes	5
Обыкновенный поползень Sitta europaea	18
Обыкновенный скворец Sturnus vulgaris	23
Обыкновенный снегирь Pyrrhula purrhula	283
Перепелятник Accipiter nisus	1
Пестрый дятел Dendrocopos major	28
Полевой воробей Passer montanus	1333
Рябинник Turdus pilaris	29
Свиристель Bombycilla garrulus	73
Серая ворона Corvus cornix	121
Сизый голубь Columba livia	177
Сойка Garrulus glandarius	60
Сорока Pica pica	83
Хохлатая синица Parus cristatus	4
Черноголовая гаичка Parus palustris	2
Черный дрозд Turdus merula	6
Чечетка обыкновенная Carduelis flammea	6
Черноголовый щегол Carduelis carduelis	10
Всего	**5763**
Сколько человек участвовало в учетах	**429**

Зимние учеты в населенных пунктах, лесу и открытых пространствах

ВИД	
Белоспинный дятел Dendrocopos leucotos	1
Большая синица Parus major	2526
Буроголовая гаичка Parus montanus	39
Ворон Corvus corax	85
Галка Corvus monedula	1519
Грач Corvus frugilegus	786
Длиннохвостая синица Aegithalos caudatus	15
Домовой воробей Passer domesticus	1852
Домовый сыч Athene noctua	1
Желна Dryocopus martius	9
Желтоголовый королек Regulus regulus	119
Зарянка Erithacus rubecula	1
Зеленый дятел Picus viridis	3
Зимняк Buteo lagopus	23
Кедровка Nucifraga cariocatactes	1
Клест-еловик Loxia curvirostra	7
Кольчатая горлица Streptopelia decaocto	14
Крапивник Troglodytes troglodytes	14
Красноголовый королек Regulus ignicapillus	1
Малый дятел Dendrocpos minor	12
Московка Parus ater	62
Обыкновенная горлица Streptopelia turtur	7
Обыкновенная зеленушка Chloris chloris	276
Обыкновенная лазоревка Parus caeruleus	149
Обыкновенная овсянка Emberiza citrinella	507
Обыкновенная пищуха Certhia familiaris	13
Обыкновенная пустельга Falco tinnunculus	4
Обыкновенный дубонос C. coccothraustes	19
Обыкновенный канюк Buteo buteo	37
Обыкновенный поползень Sitta europaea	38
Обыкновенный скворец Sturnus vulgaris	29
Обыкновенный снегирь Pyrrhula purrhula	1603
Оляпка Cinclus cinclus	1
Орлан-белохвост Haliaeetus albicilla	1
Перепелятник Accipiter nisus	16
Пестрый дятел Dendrocopos major	113
Полевой воробей Passer montanus	1665
Полевой лунь Circus cyaneus	1
Рябинник Turdus pilaris	180
Рябчик Tetrastes bonasia	2
Свиристель Bombycilla garrulus	248
Серая ворона Corvus cornix	742
Серая куропатка Perdix perdix	74
Серый сорокопут Lanius excubitor	6
Сизый голубь Columba livia	1123
Сирийский дятел Dendrocopos syriacus	2
Сойка Garrulus glandarius	189
Сорока Pica pica	252
Средний дятел Dendrocopos medius	1
Тетерев Lyrurus tetrix	1
Тетеревятник Accipiter gentilis	9
Трехпалый дятел Picoides tridactylus	8
Ушастая сова Asio otus	1
Фазан Phasianus colchicus	3
Хохлатая синица Parus cristatus	26
Хохлатый жаворонок Galerida cristata	42
Черноголовая гаичка Parus palustris	68
Черноголовый щегол Acanthis cannabina	129
Черный дрозд Turdus merula	13
Чечетка обыкновенная Carduelis flammea	819
Чиж Spinus spinus	376
Всего	**15892**


Серая ворона. Фото Н. Гулинского

Зимние учеты водоплавающих птиц				
Вид	Учтенных	Учтенных без повторных учетов	Оценка численности для Беларуси	
			мин	макс
Бекас	3	3	5	10
Белолобый гусь	2	2	1	5
Большая белая цапля	2	2	2	5
Большая выпь	4	4	5	10
Большие белоголовые чайки	372	142	150	200
Большой баклан	3	3	5	10
Большой крохаль	472	308	350	400
Гаршнеп	1	1	1	10
Гоголь обыкновенный	318	269	300	400
Гуменник	2	2	1	5
Зимородок обыкновенный	9	9	10	20
Камышница	3	3	5	10
Красноголовый нырок	55	44	60	100
Кряква	33981	15300	17000	18000
Лебедь кликун	8	8	1	10
Лебедь шипун	1819	712	750	800
Луток	30	26	30	50
Лысуха	747	491	600	800
Малая поганка	5	4	5	10
Малая чайка	1		0	1
Морская чернеть	0	0	0	5
Озерная чайка	47	14	15	30
Оляпка	1	1	1	5
Орлан - белохвост	5	4		
Пастушок	6	5	10	20
Свиязь	0	0	0	5
Серая утка	3	3	1	5
Серая цапля	61	49	50	70
Серый гусь	3	3	1	5
Сизая чайка	17	8	10	20
Хохлатая чернеть	428	390	400	500
Чернозобая гагара	3	1	1	5
Чирок свистунок	193	53	60	100
Чомга	1	1	0	1
Шилохвость	2	1	1	5
Всего	**38680**	**17939**	**19831**	**21632**

За период проведения зимних учетов было проведено 153 учета (анкеты), всего было учтено 35 видов водно-болотных птиц.

Наиболее многочисленная зимовка, суммарной численностью 6883 птицы, отмечалась, как и в прошлые годы, в г. Минске. Затем идут г. Новолукомль (1957), г. Гродно (1630), г. Барановичи (1078), г. Белозерск.

Иван Богданович, координатор зимних учетов водоплавающих птиц


Большая синица. Фото В. Федосенко

Валанцёрства



Валанцёры Мірашнічэнка Кацярына і Барысавец Ганна дапамагаюць супрацоўнікам сакратарыяту Шайкіну Руслану і Ціхно Кацярыне праводзіць пляцоўку па Салаўіным начам у Батанічным садзе

Падтрымаць дзейнасць АПБ можна не толькі фінансавымі сродкамі. У многіх аспектах нашай працы нам неабходна дапамога валанцёраў.

Чатыры сферы, дзе Вы можаце дапамагчы:

Удзел у нашых праектах, кампаніях, акцыях

Валанцёры могуць удзельнічаць у працы на пляцоўках на Восеньскія дні назірання за птушкамі, Зімнія ўлікі птушак і Салаўіныя ночы. Калі Вы жывеце ў месцы, дзе няма мясцовага аддзялення АПБ, якое арганізуе пляцоўку, Вы можаце зрабіць сваю пляцоўку пры падтрымцы сакратарыята.

Калі ў Вас ёсць жаданне правесці некалькі дзён у палявых умовах, можна паехаць на ўлікі вяртлявай чаротаўкі ці ў летнік на балота Ельня. Людзі патрэбны і на станцыі кальцавання ў г. Тураве.

Тут прыведзены толькі некалькі асобных прыкладаў, таму што кожны праект мае свае асаблівасці і сваю працу, якую могуць выконваць валанцёры.

Дапамога сакратарыяту АПБ

Нават такая простая на першы погляд справа, як рассылка сяброўскіх матэрыялаў, патрабуе ўдзелу валанцёраў. Яны дапамагаюць наклейваць адрасы на канверты, потым расфасоўваюць матэрыялы. Улічваючы, што канвертаў для рассылкі набіраецца каля 800 адзінак, удзельнічаць у рассылцы могуць некалькі валанцёраў.

Таксама перад кожнай акцыяй мы падрыхтоўваем матэрыялы для раздачы – напрыклад, для наведвальнікаў пляцовак. Тут лічба можа даходзіць нават да 2000 адзінак друкаванай прадукцыі, і без валанцёраў справіцца з такім аб'ёмам было б складана.

Не трэба забываць і пра штогадовы З'езд АПБ, для падрыхтоўкі і правядзення якога толькі намаганняў супрацоўнікаў офіса недастаткова.

Дапамога мясцовым аддзяленням АПБ

На сённяшні дзень АПБ налічвае 14 аддзяленняў ва ўсіх абласцях рэспублікі, акрамя Магілёўскай і Гомельскай. Яны ўдзельнічаюць не толькі ў нашых агульнарэспубліканскіх кампаніях, але і праводзяць свае акцыі, летнікі, выконваюць праекты і г.д. Гэта значыць, што ім, як і цэнтральнаму офісу, патрэбна Ваша падтрымка.

Каб даведацца, ці ёсць у вашай мясцовасці аддзяленне ці ініцыятыўная група, тэлефануйце ў офіс ці заходзьце на наш сайт.

Дапамога настаўнікаў і выхавальніц дзіцячага садку

Значная частка нашай працы звязана з экалагічнай адукацыяй. Каб распрацаваць цікавую і карысную праграму для дзяцей дашкольнага ўзросту і школьнікаў, нам неабходна дапамога людзей, якія кожны дзень працуюць з дзецьмі, ведаюць іх інтарэсы і могуць на практыцы скарыстаць тыя ці іншыя распрацоўкі.

Напэўна, Вы з дзецьмі праводзіце якія-небудзь незвычайныя ўрокі ці мерапрыемствы. Калі Вы можаце падзяліцца сваім вопытам з іншымі і жадаеце паўдзельнічаць у складанні экалагічна-асветніцкай праграмы – чакаем Вашых званкоў!

Гэтым магчымасці валанцёрства не абмяжоўваюцца. Людзі многіх прафесій могуць дадаць свой унёсак у нашу агульную справу. Гэта могуць быць ветэрынары, юрысты, дызайнеры, плотнікі і г.д.

Калі ў Вас ёсць вольны час і, галоўнае, жаданне дапамагчы, тэлефануйце ў офіс (запытвайце Ціхно Кацярыну). Мы будзем рады пачуць кожнага з Вас.

Сёмы чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі



Чэмпіянат гэтага году традыцыйна адбудзецца ў першую суботу восені (4 верасня) з 6 па 15 гадзіну.

Удзел можа прыняць кожны ахвотнік, у тым ліку грамадзяне замежных краін. Для гэтага патрэбна падаць (па тэлефоне альбо электроннай поштай) у Сакратарыят АПБ заяўку, у якой будзе ўказана назва каманды, яе склад (4 чалавекі; мінімум двое павінны быць старэйшыя за 18 гадоў), месца старту і нумар тэлефона для сувязі. Апошні тэрмін падачы заявак – 9 верасня 2010 г. 10 верасня ва ўдзельнікаў будзе магчымасць унесці карэктывы ў заяўкі.

З падрабязнымі правіламі правядзення чэмпіянату вы можаце азнаёміцца на сайце www.ptushki.org (Што мы робім/Конкурсы, кампаніі і акцыі/Спартыўная арніталогія) ці патэлефанаваўшы ў Сакратарыят.

Дзякуй за падтрымку!

У адным з папярэдніх нумароў бюлетэня мы распавядалі вам пра праграму прыхільнікаў АПБ. Хочацца падзякаваць усім, хто адгукнуўся і далучыўся да нас, такім спосабам падтрымаўшы нашу дзейнасць – Якімавай Таццяне Аляксандраўне, Кухарэнка Андрэю Міхайлавічу, Анішчанка Таццяне Андрэеўне, а таксама тым, хто пажадаў застацца невядомым.

Спадзяёмся на далейшае супрацоўніцтва і на тое, што ў будучыні колькасць нашых прыхільнікаў будзе толькі павялічвацца!



Фота Ківачука Аляксея



Фота Сербуна Аляксандра

У мінулым нумары было няправільна ўказана аўтарства двух фотаздымкаў. Прыносім свае выбачэнні аўтарам і друкуем фота з правільнымі подпісамі.



Дашліце sms-паведамленне са словам АПБ на нумар 0841

Мы рады паведаміць вам пра новую магчымасць звязацца з Сакратарыятам АПБ і даведацца больш пра нашу дзейнасць. Дашліце sms-паведамленне са словам АПБ на нумар 0841 – і супрацоўнік сакратарыяту патэлефануе вам.

Кошт аднаго паведамлення – 390 руб. без уліку падаткаў для абанентаў МТС і 220 руб. для абанентаў velcom. Тэхнічная падтрымка sms-сервіса прадстаўлена агенцтвам мабільнага маркетынгу StreamLine (www.mobilemarketing.by).





АПБ з'яўляецца эксклюзіўным партнёрам BirdLife International у Беларусі

(c) АПБ, 2009 Інфармацыйны бюлетэнь
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
Распаўсюджваецца бясплатна сярод сяброў АПБ
Перадрук дазваляецца пры ўмове спасылкі на бюлетэнь
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны", АПБ
Галоўны рэдактар: Віктар Фянчук
Рэдакцыйная рада: Кацярына Ціхно (адказны рэдактар), Сяргей Зуёнак, Наталля Парэчына, Руслан Шайкін, Сямён Левы
Выданне падрыхтавана пры фінансавай дапамозе RSPB, партнёра BirdLife International у Вялікабрытаніі
Калі гэты нумар бюлетэня трапіў да Вас выпадкова, а Вы жадаеце атрымліваць яго рэгулярна – далучайцеся да сяброў АПБ.

Для гэтага тэлефануйце або прыходзьце да нас:
вул. Макаёнка 8, пак.313 г. Мінск
тэл. (017) 263-06-13, (017) 263-01-30
факс (017) 265-08-11
мтс (029) 223-06-13,
velcom (029) 101-68-87
e-mail: info@ptushki.org
www.ptushki.org

Наш паштовы адрас:
а/с 306 Мінск 220050 Беларусь
Пасведчанне аб рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 2714 ад 27.06.2008.
Надрукавана ў УП "Данарыт".
Ліцэнзія ЛП № 02330/0494183 ад 03.04.2009.
Тыраж 700 паас.
Замова № 11228.